Дрыбінскі
ВЫБАР

Лістапад 2007
№15
распаўсюджваецца бясплатна

Рэформы, пенсіі ды льготы

Апошнім часам у нашым горадзе велімі часта чую, як простыя людзі ў чарзе ў краме альбо едучы ў маршрутцы, з трывогаю абмяркоўваюць хуткае скасаваньне льгот. Студэнтаў пакуль не вельмі цікавіць гэтая тэма, бо для нашай моладзі нехарактэрна дбаць аб будучыні. Але гэта пакуль. Наперадзе студэнтаў усё роўна чакаюць чарговыя фінансавыя праблемы. Але ж паспрабуем паглядзець на льготы як на з'яву.

Навогул, у нашай дзяржаве сам сэнс льготаў даўно падменены. Бо калі паўкраіны льготнікаў, дык хто тады такія іншая палова? Няўдачнікі? Злодзеі? Багацеі? Лайдакі? У цывілізаваным сьвеце, дзе сумленнаму, працавітаму чалавеку гарантаваны годны ўзровень жыцця, так сама існыюць льготы. Але іх атрымліваюць толькі лепшыя людзі за выбітныя заслугі перад дзяржавай і грамадзтвам і галоўнай мэтай прадстаўленьня льготы з'яўлаецца падкрэсленьне высокага сацыяльнага статуса канкрэтнай асобы. Матэрыяльна на Захадзе ніхто не залежыць ад льготаў. У нас жа за 90 гадоў жыцця ў савецкім рабстве дзяржава так і не здолела даць народу нармальнага жыцця. Дык хітруны - наменклатуршчыкі пачалі раздаваць розным катэгорыям "пралетарыяў"(не важна ці пралетарыяў па родзе працы, ці па складу розума) льготы, каб хоць чымсці, нават ва ўмовах жахлівага жыцця, выдзеліць пэўныя сацыяльныя группы. У выніку і адзін сусед і другі жылі ў галечы, але адзін быў льготнікам, чым вельмі ганарыўся, а другі – ня быў, што пыніжала і параджала зайздрасць.

З гадамі, ня маючы іншых стымулаў, уладам прыходзілася раздаваць льготы ўсё большым і большым группам насельніцтва, што практычна пазбавіла сэнсу самое існаваньне льгот. Але сёняшнія ўлады, не прыдумалі нічога лепшага, чым проста іх скасаваць. Гэта вельмі неразумны крок. Бо ў значнай часткі нашага грамадзтва нічога акрамя льготаў (няхай шмат у чым фіктыўных) няма. А забіраць у дзяцей апошнюю цацку можа толькі вельмі грубы, нячулы чалавек.

На маю думку адмене льготаў (рана ці позна іх прыйшлося б адмяняць) павінна была папярэднічыць пенсійная рэформа і рэформа аховы здароўя. Асноўным момантам пенсійнай рэформы павінна стаць скасаваньне шалёнай разьбежкі паміж мінімальнай і максімальнай пенсіяй. Мы - бедная дзяржава, таму ня можам плаціць высокіх пенсій. Але абавязаны даць пенсіянеру магчымасць выжыць. Нават за савецкім часам наменклатура разумела гэта і разрыў між нашбольшай і найменьшай пенсіяй складаў 1,5 – 2 разы. Цяпер жа былая даярка ці палявод (праца на знос) атрымлівае выплату у 4 – 5 разоў меней чым розныя вертыкальшчыкі, ваенныя, ці, як кажуць, " сілавікі ".

Не спрачаюся, шмат хто з нашых учарашніх і сёняшніх "вертыкальшчыкаў" працуе шмат. Але плёну для народа ад іх працы як не было, так і не праглядаецца. Таму, калі жыццё нялёгкае, дык будзем несьці гэты цяжар разам, а не перакладаць на плечы простага чалавека, какб ён мог і ў старасці праехаць на аўтобусе, электрычцы, ці цягніку да дзяцей не выбіраючы - пад'есці лішні раз ці ехаць? Падобна сёньня складаюцца справы і з медыцынай. Што за сэнс даваць, а потым скасоўваць розныя льготы на лекі, пратэзаваньне зубоў і інш? Трэба яшчэ да адмены льготаў правесьці медычную рэформу, увесьці страхавую медыцыну і пашырыць колькасць прыватных клінік. Каб любы чалавек частку пенсіі, ці заробка (можна і аўтаматычна) выплочваў на страхаваньне здароўя і мог атрымаць якасную медычную дапамогу ў дзяржаўнай, альбо прыватнай клініцы. Гэта рэформа вельмі хутка прымусіла б і нашы дзяржаўныя медычныя ўстановы па іншаму адносіцца да пацыентаў, бо з'явілася б канкурэнцыя і кожны сам бы вырашаў у якой клініцы рабіць аперацыю, ці ставіць зубы.

Вось такія простыя крокі якія, на мой погляд, дапамаглі б нам, паважаныя землякі, у сённяшні цяжкі час. Шкада, што нашы цяперашнія ўлады ўсе, як заўжды, вырашаюць не праз галаву. І толькі мы разам, паважаныя землякі, можам дамагчыся пабудовы больш справядлівага, адказнага грамадцтва.

Андрэй ЮРКОЎ
Тэл. 623 61 08

ДЗЕНЬ, ЯКІ НЯ СТАЎ СВЯТАМ

Чарговы раз семага лістапада ў жыхароў Беларусі быў непрацоўны дзень. Але што гэта за дата і чаму ад яе святкавання адмовіліся ўсе астатнія былыя савецкія рэспублікі? Чытайце артыкул гісторыка.

1. НАРАДЖЭННЕ

Абазначым толькі самыя істотныя гістарычныя падзеі, якія звязаны з гэтым днём. Для гэтага вернемся на 90 гадоў назад.

Напрыканцы лютага 1917 г. у Расіі перамагла дэмакратычная рэвалюцыя, было звергнута самаўладдзе. Ленін сцвярджаў, што Расія стала самай вольнай краінай свету. Са згоды Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў кіраванне краінай было даверана Часоваму ўраду. Ён павінен быў правесці шэраг пераўтварэнняў, а галоўнае – забяспечыць свабодныя, раўнапраўныя выбары ва Ўсерасійскі Ўстаноўчы сход, перадаць яму ўладу і спыніць сваю дзейнасць. Далейшае развіццё краіны ўжо вызначаў бы названы Сход.

Аднак Часовы ўрад па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах ня здолеў ажыццявіць мерапрыемствы, якія б далі яму падтрымку большасці насельніцтва. Сялянства хацела хутчэй захапіць памешчыцкую зямлю, рабочыя хацелі паляпшэння свайго жыцця, у многіх наступіла стомленасць ад вайны з Германіяй. У такіх варунках левападыкальныя, як сказалі б сёння, экстрэмісцкія сілы, імкнуліся навязаць сваю мадэль развіцця краіны. Лідэрам гэтых сілаў стала бальшавіцкая партыя начале з Леніным. Бальшавікі сфармулявалі простыя і зразумелыя лозунгі: "Зямля – сялянам!", "Фабрыкі – рабочым!". "Мір – народам!". Яны маглі прыйсці да ўлады альбо дэмакратычным шляхам (праз выбары), альбо ажыццявіць гвалтоўнае звяржэнне законнага Часовага ўрада.

На хвалі папулізму восенню 1917 г. бальшавікі сталі пераважаць у Петраградскім і Маскоўскім Саветах, але на выбарах ва Ўсерасійскі Ўстаноўчы сход бальшавіцкая партыя ня здолела атрымаць перамогу. Не чакаючы склікання Ўсерасійскага Ўстаноўчага сходу, выкарыстаўшы нерашучасць Часовага ўрада, абапіраючыся на рэвалюцыйную эйфарыю салдат і матросаў, у ноч на 25 кастрычніка 1917 г. (па юліянскаму календару) бальшавікі арганізавалі сваіх прыхільнікаў на захоп Зімняга палаца і арыштавалі Часовы ўрад. У той жа дзень яны стварылі практычна аднапартыйны ўрад (прысутнасць некалькіх прадстаўнікоў ад левых эсэраў і анархістаў агульную карціну не змяняла). Астатнія сацыялістычныя партыі расцанілі гэта як дзяржаўны пераварот і асудзілі гвалтоўныя дзеянні. Фактычна з гэтага часу пачалося ўстанаўленне манаполіі бальшавікоў (будучых камуністаў) на ўладу. Дзень гвалтоўнага захопу ўлады (7 лістапада па грыгарыянскаму каляндару) у свае рукі бальшавікі зрабілі культавым святам для ўсіх падуладных ім народаў былой Расійскай Імперыі.

2. ЗАМЕНА НАЗВЫ

Нягледзячы на захоп бальшавікамі ўлады ў Петраградзе, у лістападзе завяршыліся выбары ва Ўсерасійскі Ўстаноўчы сход. Прадстаўнікі бальшавісцкай патрыі атрымалі толькі каля 25% галасоў. Такім чынам, калі б улада вызначалася дэмакратычным шляхам, то яна у рукі бальшавікоў не трапіла б. Працягам бальшавіцкага гвалту сталі разгон Устаноўчага сходу і расстрэл дэманстрацыі на вуліцах Петраграда 5 студзеня 1918 г.

Характэрна, што ў першае дзесяцігоддзе тэрмін "рэвалюцыя" у дачыненні 7 лістапада амаль не прымяняўся. Афіцыйна падзеі часцей называліся ***Кастрычніцкім пераваротам.*** Дастаткова заглянуць у творы Леніна. Ён часта ўжывае менавіта ***"октябрьский переворот"***. Такой жа тэрміналогіяй да канца 1920-х гадоў карысталіся і іншыя бальшавіцкія дзеячы.Так, артыкул Сталіна1927 г. называўся "Об октябрьском перевороте". Нават на пачатку 1950-х гадоў Сталін выкарыстоўваў тэрмін "пераварот".

Паступова стала відавочна, што слова "пераварот" успрымаецца як змова і супрацьпраўная змена ўлады. Менавіта гэта і падкрэслівалі апаненты бальшавікоў. Таму тэрмін "пераварот" быў выкрэслены з афіцыйнай прапаганды. Сталі замацоўвацца назвы *Кастрычніцкая рэвалюцыя, Вялікі Кастрычнік* і, нарэшце, к 1930-м гадам – *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.* Але ў крытычнай да Савецкай улады літаратуры выраз "кастрычніцкі пераварот" з яго негатыўным зместам застаўся. Калі ж у перыяд "перабудовы" і ў пачатку 1990-х гг. з'явілася шмат інфармацыі аб падзеях 1917 г., аб шматлікіх злачынствах уладаў СССР у 20-я– 40-я гады, то адносіны значнай часткі насельніцтва да гэтага свята змяніліся.

3. АЦЭНКІ

Вялізарны ўплыў кастрычніцкіх падзей на развіццё тэрыторый былой Расійскай Імперыі і ўсяго свету прызнаецца практычна ўсімі гісторыкамі. Аднак існуць вялікія разыходжанні ў ацэнцы характару гэтага ўплыву. Яны часам дыяметральна супрацьлеглыя – ад ухвалення, як захаванне і узмацненне вялікай дзяржавы (выхаванне вялікадзяржаўнага культу), як сапраўднага шляху да ўстанаўлення ладу сацыяльнай справядлівасці, да сцвярджэння аб пачатку павароту ў тупіковы напрамак развіцця з вялізарнымі чалавечымі стратамі.

Сапраўды, пэўны час кіруемы камуністамі СССР быў велізарнай па тэрыторыі і дастаткова магутнай (найперш у ваеннай сферы) дзяржавай. Але па якасці жыцця насельніцтва СССР заўсёды адставаў практычна ад большасці еўрапейскіх краін. Эканамічная і палітычная мадэль, створаная ў 1917 г., не вытрымала выпрабавання часам. У значнай часткі насельніцтва дата 7 лістапада звязана з грамадзянскай вайной, масавымі рэпрэсіямі, таталітарызмам, палітычным бяспраўем насельніцтва. Фактычна вышэйшая партыйна-савецкая бюракратыя доўгі час вяла сапраўдную вайну супраць уласнага народа, якая дасягнула свайго апагею ў 1937 годзе.

Удумайцеся, паважаныя чытачы, праз 20 гадоў пасля "Великого Октября", калі ўжо вырасла новае пакаленне, быў раскручаны махавік дзяржаўнай машыны на знішчэнне так званых "врагов народа". Невыпадкова ва ўсіх былых савецкіх рэспубліках напачатку лістапада праходзяць дні памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў. На думку аўтара, такі дзень даўно пара ўвесці ў Беларусі ў якасці афіцыйнага на дзяржаўным узроўні. Яго пакуль няма, але восеньскія "дзяды" паступова становяцца днём памінання без віны асуджаных і забітых.

Своеасаблівым пратэстам супраць савецкіх парадкаў стала адмаўленне краінаў, якія дасягнулі самастойнасці ў выніку распаду СССР, ад свята, якое сімвалізавала саму сутнасць савецкай сістэмы. Большасць краінаў ўвогуле адверглі яго як афіцыйнае свята. Цікава атрымалася ў Расіі. Спачатку яго паспрабавалі ператварыць у Дзень прымірэння і згоды, аднак ён не прыжыўся. Тады расійскія ўлады прызначылі свята на 4 лістапада, памылкова вызначыўшы яго як дзень вызвалення Масквы ад польскіх акупантаў апалчэннем пад кіраўніцтвам Мініна і Пажарскага. На самой жа справе ў Маскве ў якасці "акупантаў" пераважалі ліцвіны (так раней называліся беларусы), і вызвалена была Масква не 4, а 7 лістапада. Бачыце, руская праваслаўная царква і расійскія ўлады так імкнуліся ацурацца ад 7 лістапада, што нават гістарычную храналогію парушылі.

Непахіснымі засталіся толькі беларускія ўлады: 7 лістапада па-ранейшаму зафіксавана ў рэестры дзяржаўных святаў як рэлікт савецкай эпохі. Так мовячы, захоўваецца пераемнасць.

Як бы ні было, але на фоне аддаленасці па часе, знікнення масіраванай прапаганды "культавай даты" і адкрыцця праўды пра савецкую сістэму розных часоў адносіны да 7 лістапада змяніліся. Большасць насельніцтва, асабліва моладзь, сёння не ўспрымаюць гэтую дату як важную і значную. У лепшым выпадку яе ўспамінаюць як нейкую сімвалічную мяжу паміж "старой" і "новай" эпохамі. Сам сэнс гэтых эпох часта застаецца за кадрам.

Аляксандр Каданчык, кандыдат гістарычных навук

Александр Ильянов освобожден от должности

Пятого ноября Борис Батура провёл собрание актива Белыничского района, на котором объявил об отставке председателя Белыничского райисполкома, в связи с поступком, противоречащим нормам морали. Сам Ильянов к своим бывшим подчинённым выйти не захотел, предпочёл отсидеться у себя в кабинете. Но они всё-таки смогли увидеть своего бывшего «шефа» на следующий день, когда сотрудники весьма уважаемой силовой структуры привезли его (по свидетельствам очевидцев - в наручниках) для проведения неких розыскных мероприятий в «высоком» кабинете.

С Сашей Ильяновым в своё время у нас сложились неплохие отношения, всё-таки учились вместе на родном зоофаке и иногда вместе употребляли народный напиток «чернило». Хотя уже в то время у него было две «кликухи», которые хорошо известны, а посему приводить их не будем. И, надо сказать, он им полностью соответствовал.

Повторно довелось встретится со старым знакомым уже после того, когда он был назначен председателем Белыничского райисполкома. Несмотря на старое знакомство, проработали в одной команде совсем недолго, потому что с годами Саша стал таким хамом, что под его началом мог работать только не уважающий себя человек. Такие и остались. Сотрудники за спиной называли шефа нелицеприятной кличкой, а в лицо выказывали крайнюю степень преданности. «Хозяин» делал в районе всё, что хотел. На ключевые должности были назначены свои люди. Все это знали, но, как образно выразился глава государства, "все хотели хрюкать возле кормушки".

Кто-то из милицейских чинов говорил "я служу главе района", кто-то другой думал, как приватизировать третью служебную квартиру. Одна газета "Паходня" регулярно поднимала вопрос о безобразиях, творящихся в районе, но всем власть предержащим было глубоко "фиолетово". Как говорил куратор Белыничского района из КГБ :"система работает". Но, слава Богу, есть еще в стране подразделения, ребята из которых, зачастую рискуя благополучием своих семей, на самом деле пытаются выполнить свой долг до конца.

Иван Борисов, Белыничи

Одобрено бессрочное президентство Уго Чавеса

В Венесуэле одобрили бессрочное президентство Уго Чавеса. Такое решение принял парламент страны - Национальная ассамблея. Подавляющим большинством голосов - был поддержан проект изменений венесуэльской конституции, согласно которому срок президентских полномочий будет существенно увеличен.

Референдум по реформе пройдет 2 декабря, и согласно опросам, граждане республики скорее всего проголосуют "за" изменения. Причина этого и в популярности Чавеса и в том, что пакет мер предполагает также сокращение рабочего дня и поддержку уличных торговцев.

Ранее в Каракасе прошла демонстрация противников изменения конституции - манифестация переросла в столкновения с полицией. А сегодня на столичных улицах митингуют уже сторонники Чавеса.

Вести.Ru

Затрыманьні ў Салігорску ля помніка Леніну

Група маладафронтаўцаў разгарнула расьцяжку з надпісам "Камунізм – пад трыбунал" ў момант, калі кіраўніцтва салігорскага выканкаму ўскладала кветкі да помніку Леніну.

Затрыманых братоў Ільлю ды Івана Шылаў, а таксама Хрысьціну Самойлаву завезьлі ў райаддзел міліцыі. Усе трое непаўналетнія. На знак салідарнасьці з затрыманымі група моладзі зладзіла акцыю ля будынку міліцыі.

Да помніка Дзяржынскаму ўсклалі вянок з калючага дроту са стужкай з надпісам "Ахвярам палітычных рэпрэсіяў. 1917-1991. 1994-2007".

У МАГІЛЁВЕ З'ЯВІЛАСЯ БЕЛАРУСКАМОЎНАЯ ГРУПА Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ

Праўда, паводле старшыні магілёўскай абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы Алега Дзячкова, дзейнічае яна пакуль толькі на паперы. Зараз у памяшканні будучай групы робіцца рамонт.

Загад аб адкрыцці ў дзіцячым садку №81 першай ў горадзе беларускамоўнай групы падпісаў начальнік аддзела адукацыі Ленінскага раёна Магілёва Аляксандр Гапееў. Як распавёў *Рацыі* **Алег Дзячкоў**, на сённяшні дзень ёсць чатыры заявы ад бацькоў, якія хочуць запісаць дзяцей у такую групу.

Гэта цікавая акалічнасць, бо раней гарадскія ўлады патрабавалі як мінімум 12 заяваў. Як патлумачыў Дзячкоў, ад пачатку ўлады казалі аб неабходнасці 25 заяваў, потым 20, нарэшце 12. А па законе аказался, што дастаткова трох.

Па меркаванні Алега Дзячкова, у Магілёве значна больш жадаючых выхоўваць сваіх дзяцей па-беларуску - і чыноўнікі ведаюць гэта, таму яны і дазволілі стварэнне беларускамоўнай групы. Калі яна пачне дзейнічаць, колькасць дзяцей там павялічыцца.

Ян МАЎЭР

Віктар Шэйман больш не памочнік Аляксандра Лукашэнкі

Аляксандр Лукашэнка сваім указам унёс зьмены ў склад Рады бясьпекі. Віктара Шэйман застаўся на пасадзе дзяржсакратара Рады бясьпекі, але ўжо не займае пасаду памочніка прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы. Цяпер у складзе Рады бясьпекі застаўся адзін памочнік прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы – Віктар Лукашэнка, старэйшы сын Аляксандра Лукашэнкі.

На пачатку лістапада Аляксандар Лукашэнка вынес Віктару Шэйману вымову ў сувязі са справай былога міліцыянта Сяргейчыка, прызнанага судом сэрыйным забойцам.

Віктар Лукашэнка працуе памочнікам прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы з пачатку 2005-га года. Сёлета ў студзені сын Лукашэнкі быў уведзены ў склад Рады бясьпекі.

Назіральнікі не выключаюць, што паміж малодшым Лукашэнкам і Віктарам Шэйманам вядзецца барацьба за ўплыў, якая апошнім часам абвастрылася.

ПРАВОВАЯ ПОМОЩЬ НАСЕЛЕНИЮ

Телефоны.
8 029 640 25 53,
384 00 29

Дрыбінскі выбар №15, лістапад 2007 года
Газэта Дрыбінскага раёна
Выдавец - Андрэй Юркоў
Наклад 299 асобнікаў
Газэта выдаецца і распаўсюджваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь